## ХАЙ СНЕГ, ХАЙ МАРОЗ — У ВЯСНОВЫМ ПАДЛЕСКУ КРАСУЮЦЬ БЛАКІТНЫЯ КВЕТКІ — ПРАЛЕСКІ

*(Паліна Грынчанка, Алена Царашкова)*



Прачытайце загадку. Адгадайце яе.

З сонейкам ды з кветкамі прыходзіць.
З ручаямі карагоды водзіць.
Абудзіла ўсё наўкол ад сну.
Сустракайце песнямі … .

*Лёля Багдановіч.*

Якія словы дапамаглі адгадаць загадку?

Паслухайце апавяданне. Назавіце першыя прыкметы вясны.

## Першы колер вясны

*Фама Рамашка*

Прыгрэла сонейка. Пасыпаўся з галінак дрэў калючы іней. Неба стала блакітнае-блакітнае.

— Дзінь-дзінь-дзінь, — закапалі кропелькі з ледзяша, які звісаў са страхі́.

Адна кропелька, другая, трэцяя. Блакітныя, бы кавалачкі неба. Ды і сам лядзяш



блакітны. Зірнула Алеська на снег. І ён блакітны. І дрэвы блакітныя. І нават сцяжынка. Прыжмурыла дзяўчынка вочы і пытае:

— Мамачка, чаму ўсё стала блакітнае?

— Гэта, дачушка, першы колер вясны, — адказала мама.

— Зіма канчаецца! Зіма канчаецца! — узрадавалася Алеська.

1. Які першы колер вясны? Што выглядала блакітным?
2. Што дзяўчынцы нагадвалі кропелькі, якія капалі з ледзяша?
3. Прачытайце твор. Раскажыце, як пачыналася вясна.



Адгадайце загадку.

З-пад снегу выйшла,
Расцвіла,
І так,
Што аж зіма ўцякла.

*Міхась Пазнякоў.*



Пралескі — першыя веснікі вясны. Якія першацветы вы яшчэ ведаеце?
Паслухайце верш.

## Пралеска

*Вера Вярба*



Белыя бярозы
Спалі на ўзлеску,
Як сваю галоўку
Ўзняла пралеска.

Тоненькую ножку
З-пад пярыны белай
На зямлю пралеска
Ставіла нясмела.

А снягі наўкола —
Ні канца, ні краю.
Страшна стала кветцы
«Я адна — жывая».

Кажа зверху сонца:
«Зорачка лясная,
З новым нараджэннем
Я цябе вітаю!»

Белыя бярозы
Разам зашапталі:
«Мы цябе, пралеска,
Усю зіму чакалі».

І старая елка
Голасна ўздыхнула:
«Вясна надыходзіць,
А зіма мінула».

1. Калі і дзе расцвіла пралеска? Як пра гэта сказаў аўтар?
2. Прачытайце, як сустракалі пралеску сонейка, бярозы.
3. Што сказала старая елка, калі расцвіла пралеска? Прачытайце.
4. Якія словы выкарыстаў аўтар, каб намаляваць пралеску? Як адносіцца аўтар да кветкі?

Хто з вас бачыў гэту кветачку? Намалюйце словамі, як выглядае пралеска.
Прачытайце прыкмету. Што новае вы даведаліся пра вясну?

Калі гракі адразу на гняздо ляцяць, вясна будзе цёплая.